**УДК 94(474.5)“1608 –1609”**

# ІНФЛЯНЦКАЯ КАМПАНІЯ ВОЙСКА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА 1608 – 1609 ГАДОЎ

***В.У. ЯКУБАЎ***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Дэманструецца даследаванне па ўдакладненні і апісанні раней маладаследаванай у сусветнай гістарыяграфіі ваеннай кампаніі войска Вялікага Княства Літоўскага. Аналізуецца склад удзельнікаў і крыніцы фінансавання баявых дзеянняў 1608 – 1609 гадоў супраць шведаў у Інфлянтах. Разгядаюцца тактычныя і псіхалагічныя прыёмы вайсковага кіраўніцтва, якія дазаволілі, з аднаго боку, выканаць тактычныя і стратэгічныя задачы кампаніі, а з іншага – сталі пралогам для Гарадзенскай канфедэрацыі 1609 – 1610 гадоў, у склад якой упершыню ў айчыннай гісторыі ўвайшоў вялікі гетман Княства Літоўскага.*

**Уводзіны.** У гістарыяграфіі Усходняй і Цэнтральнай Еўропы яшчэ не распрацаванымі застаюцца пытанні вайны на тэрыторыі Інфлянтаў паміж Вялікім Княствам Літоўскім (ВКЛ) і Швецыяй у 1600 – 1611 гады і кампаніі 1609 года як яе завяршаючай часткі. Інфлянты з 1589 года з’яўляліся сумесным уладаннем Княства Літоўскага і Польскай Кароны, прыбыткі і выдаткі павінны былі падзяляцца пароўну. Аднак на практыцы эканамічная зацікаўленасць беларускіх і літоўскіх земляў у Дзвінскім гандлі і атрыманне большасці, стаўшых сенатарскімі ў 1598 годзе, інфлянцкіх пасад прадстаўнікамі ВКЛ прывялі да разгляду палякамі вайны са Швецыяй 1600 – 1611 гадоў за гэтыя землі як праблемы ВКЛ.

Традыцыйна сусветная гістарыяграфія больш увагі надавала ўдзелу шляхты ўсёй Рэчы Паспалітай у “рускай Смуце”, якая пачалася ў гэты час, а пытанні вайны са Швецыяй падаваліся фонава ў форме абагульненняў. А. Шэлангоўскі даказываў важнасць у палітыцы Польшчы ў 1544 – 1621 гадах прэтэнзій на Maris Dominium – панаванне ў басейне Балтыйскага мора [1]. Гэты канфлікт М. Робертс разглядаў як дынастычны паміж Жыгімонтам і Карлам Вазамі ў 1598 – 1611 гадах, А. Ціла – як феадальны канфлікт за землі Інфлянтаў 1600 – 1629 гадоў [2]. У працах польскіх гісторыкаў С. Хербста і Г. Віснера больш дэталёва разгледжаны баявыя дзеянні “польска-літоўскіх” войскаў падчас Інфлянцкіх кампаній 1600 – 1605 гадоў, дзе прысутнічалі Каронныя кантынгенты, але дзеянні 1608 – 1609 гадоў, якія праводзіліся войскам ВКЛ і інфлянцкай земскай службай, засталіся па-за іх ўвагай, а менавіта ў гэтую кампанію была вызвалена ад шведаў Парнава і за год разбіта ў суме як мінімум 12 000 шведаў.

**Асноўная частка.** Узнаўленне баявых дзеянняў у Інфлянтах адбылося без афіцыйнага абвяшчэння вайны з боку Швецыі і нечакана для кіраўніцтва Рэчы Паспалітай [3]. Паводле перамір’я 1605 года, паміж Я.К. Хадкевічам і кіраўнікам шведскага войска ў Інфлянтах Эўхімам Фрэдэрыкам Мансфельдам (Joachim Frederick von Mansfeld) замацоўвалася свабода гандлю, абяцалася сустрэча камісараў, якія былі ўпаўнаважанымі для правядзення мірных перагавораў. Шведы захавалі захопленыя Парнаву і Шалец, а Рэч Паспалітая – шведскі Белы Камень. У 1607 годзе Карл IX аб’явіў, што Э.Ф. Мансфельд не з’яўляўся ўпаўнаважаным заключаць перамір’е, і скасаваў яго.

Пасля завяршэння рокашу ў ВКЛ у 1606 – 1608 гадах і падпісання 20 чэрвеня 1608 года перамір’я паміж Я. Радзівілам і Я.К. Хадкевічам узброеныя сілы ракашан былі распушчаны [4]. Пазбавіўшыся палітычнай падтрымкі біржанскіх Радзівілаў, частка берасцейскіх канфедэратаў у 1605 – 1608 гадах завербавалася ў атрады, якія фарміраваў Я.П. Сапега для Ілжэдзмітрыя II, і выехала ў межы Маскоўскай дзяржавы [5, с. 92]. Аднак частка іншых былых “інфлянцкіх жаўнераў” працягвала займаць эканоміі ў ВКЛ. Яшчэ ў пачатку 1609 года сенатары ВКЛ патрабавалі ад караля вываду былых канфедэратаў у Інфлянты, ці ў паход на Пскоў і Вялікія Лукі [6].

У пачатку ліпеня 1607 года шведы падпільнавалі, разграмілі, узялі ў палон пад Белым Камнем патрульны аддзел Андрэя Збароўскага, які замяшчаў на пасадзе адміністратара Лівоніі Я.К. Хадкевіча, а потым захапілі сам горад. За зіму 1608 года іх аддзелы дайшлі да Біржаў і Зэмбарка. Адначасова шведскі сенат прапанаваў лістом ад 17 красавіка 1608 года абмен палоннымі [7, с. 40]. Паралельна вяліся баявыя дзеянні, таму дыпламатычнае ліставанне, якое было у гэтыя гады, можна разглядаць як спробу адцягнення ўвагі.

У чэрвені 1608 года ў вусце Дзвіны прыбыў на 60 караблях Карл IX, праз тыдзень – яшчэ 80 караблёў прывезлі зброю і падмацаванне. Кіраўніком шведаў у Інфлянтах быў прызначаны Э.Ф. Мансфельд. Агульная колькасць наяўнага ў правінцыі войска ВКЛ на момант пачатку баявых дзеянняў складала 600 чалавек. Месцам канцэнтрацыі сіл Рэчы Паспалітай у правінцыі быў абраны Дэрпт. Сюды 20 лютага 1608 года прыбылі ўцекачы з Феліна з пушкарамі, гарматамі і правізіяй, на чале з А. Валовічам, якія пасля бунту

нямецкіх драбаў-наёмнікаў не сталі абараняць горад ад падступіўшых 5000 ворагаў і адышлі пад ахову асноўных сіл [8].

Пакуль не было вырашана пытанне з будучай аплатай за службу, Я.К. Хадкевіч не мог пачаць актыўных дзеянняў. У маі 1608 года жаўнеры, якія ўдзельнічалі ў канфедэрацыях войска ў ВКЛ і пажадалі працягнуць дзяржаўную службу, былі накіраваны з-пад Берасця да Дынамюнда [9]. Акрамя таго, што на выплату ім пайшлі ўсе прыбыткі з падаткаў і калекта ("тавараскія складкі") скарбу ВКЛ за 1606 – 1608 гады – 328404 злотых, падскарбію ВКЛ Ярашу Валовічу прыйшлося пазычыць у розных прыватных асоб яшчэ 122725,19 злотых і 12,5 пенезяў [10], а Я.К. Хадкевіч за 1605 – 1608 гады пазычыў і выдаткаваў з асабістых сродкаў інфлянцкаму войску і канфедэратам 70 622 злотых. Палову з іх быў павінен кампенсаваць скарб ВКЛ, рэшту – Польская Карона [11]. Хадкевічу ўдалося ўзяць у польскім кварцяным скарбе ў Раве толькі 4300 злотых, грошай на найманне фурманаў і пяхоты бракавала [3]. Хаця ў 1608 – 1609 гадах у гарнізоннай службе, сапёрных працах і баях выкарысталі жамойцкіх і берасцейскіх выбранцаў, але іх было замала для выканання ўсіх тактычных задач.

Вялікі гетман ВКЛ высылаў лісты і выступаў на сойміках, заклікаючы шляхту да ўдзелу ў новай інфлянцкай экспедыцыі. Месцам збору быў прызначаны яго замак у Ляхавічах. Сюды сабралося 1400 вершнікаў, у тым ліку атрады, сфарміраваныя Валовічамі, Кішкамі, Хадкевічамі і Радзівіламі (М.К. Радзівіл выставіў почт у 200, Альбрыхт Радзівіл – у 300 чалавек), калі першыя былі рэгалістамі і лаялістамі у час рокашу, дык апошнім было важна даказаць сваю лаяльнасць каралю [12, с. 208].

Калі прааналізаваць склад удзельнікаў кампаніі тэрытарыяльна – асноўную масу склалі прадстаўнікі заходняй і цэнтральнай часткі ВКЛ, дзе знаходзіліся ўладанні азначаных магнацкіх родаў, а ўсходнебеларускія землі на гэты момант былі ўжо ўцягнуты ў інтэрвенцыю ў Маскоўскую дзяржаву. У кастрычніку 1608 года войска, складзенае амаль цалкам з прадстаўнікоў і на грошы ВКЛ, выправілася ў Інфлянты [9; 13]. Перад імі ставілася задача вызваліць занятыя шведамі гарады і скончыць вайну ў Інфлянтах.

Пытанне забеспячэння дзяржаўным фінансаваннем службы ў Інфлянтах заставалася адкрытым і вострым для ВКЛ. Так, яно стаяла першым пунктам ў інструкцыі полацкага сойміка ад 4 снежня 1608 г., якая даручала паслам пагадзіцца на адзін ці два валочных падаткі і ўсё, што будзе неабходна для хуткага сканчэння інфлянцкай вайны, "не губляючы час у таргоўлі" [14, с. 71]. На варшаўскі сойм 15 студзеня – 26 лютага 1609 года, маршалкам якога быў абраны будучы гарадзенскі староста Крыштоф Весялоўскі, паслом ад інфлянцкага войска прыбыў Траян Каханоўскі, які 15 студзеня 1609 года папрасіў выплаціць рэшту абяцанага жолду да дня св. Міхала 29 верасня 1609 года. Сойм прыняў падаткі (валочны, чопавы, шосавы, пагалоўны яўрэйскі, воднае мыта) і прызначыў іх *выключна на вайну ў Інфлянтах*. Паслы ад войска далі згоду служыць у крэдыт да 29 верасня 1609 года. Акрамя таго, досвед жаўнерскага свавольства 1600 – 1608 гадоў стаў прычынай зацвярджэння канстытуцыі "Аб парадку паводзін жаўнераў" [15, с. 463] і "Гетманскіх вайсковых артыкулаў 1609 года", у якіх пад пагрозай смяротнай кары і канфіскацыі маёмасці былі забаронены канфедэрацыі ў войску і любое самавольнае размяшчэнне жаўнераў ва ўладаннях свецкіх і духоўных феадалаў [15, с. 478 – 482].

На момант прыбыцця войска ВКЛ у раён баявых дзеянняў шведы ўжо авалодалі Белым Каменем (4 ліпеня 1607 г.), Фелінам (люты 1608 г.), Дынамюндам (27 ліпеня 1608 г.), Кокенгаўзам (8 жніўня 1608 г.) [12, с. 203]. Калі шведы выйшлі да Кокенгаўза з гарматамі і "гатовымі мастамі", узнікла пагроза іх пераправы праз Дзвіну і пераносу баявых дзеянняў непасрэдна на тэрыторыю ВКЛ. Па гэтай прычыне яшчэ ў жніўні 1608 года кароль заклікаў шляхту Упіцкага і Вількамірскага паветаў тэрмінова ехаць да Дзвіны. Фарміраванне і кіраўніцтва апалчэннем было даручана павятовым маршалкам [16].

Ужо 28 кастрычніка 1608 года шведы здалі Кокенгаўз [17, с. 123]. Непасрэдная пагроза землям ВКЛ была ліквідавана. Зімой 1609 года пасля прыезду Я.К. Хадкевіча ў Інфлянты прыблізна двухтысячнае войска ВКЛ і інфлянцкая земская служба распачалі новую кампанію. Для выканання аператыўных задач і лепшага забеспячэння сілы былі падзеленыя. Тры гусарскія харугвы Я.К. Хадкевіча, рота наўгародскага ваяводы Тэадора Скуміна Тышкевіча, сына брэсцкага старасты Гераніма Хадкевіча, Крыштофа, земскага харужага ВКЛ Андрэя Валовіча, 150 чалавек люцынскага старасты Томаша Дубровы і Януша Кішкі зімавалі пад Сандзэлем. Другая групоўка блакіравала шведаў у Дынаменце: рота польнага пісара ВКЛ Тэадора Ляцкага, двухсотасабовая конная казацкая рота наваградскіх татараў Багдана (Фурсавіча), пяхотныя роты Я.К. Хадкевіча ў 150 чалавек, Шчаснага Невяроўскага і шкоцкія наёмнікі Хіла з Рыгі [12, с. 208 – 209]. Ротамі, выстаўленымі Я.К. Хадкевічам, падчас яго адсутнасці кіравалі: А. Млоцкі, (?) Хамец, Ж. Тымінскі і Ж. Рагазінскі, Глябовічамі – (?) Пятровіч, польскімі ротамі С. Казаноўскага – Сабанскі, Рудніцкі, Тамашоўскі і г.д. [13]. Акрамя таго, у адрозненне ад іншых кампаній, войскам ВКЛ дзейсна дапамаглі інфлянцкія немцы: Я. Фаренсбах выставіў асабовую роту з 200 французкіх рыцараў, 100 рэйтараў выставіў К. Тызенгаўз, 100 рыжскіх кнехтаў – Б. Вал, а таксама В. Платенберг, В. Фаренсбах [13]. Павелічэнню ўдзела інфлянцкіх немцаў у вайне на баку ВКЛ садзейнічала і пазіцыя Я.К. Хадкевіча адносна іх інтарэсаў як

інфлянцкага адміністратара, і атрыманне інфлянцамі згодна з рашэннем сойма 1607 года доступу да альтэрнаты вакантных пасад у іх роднай правінцыі – рэальнае ўраўнанне іх маёмасных і палітычных правоў з іншымі грамадзянамі Рэчы Паспалітай на ўсёй тэрыторыі дзяржавы. Для абароны рыжскага порту былі наняты 8 галандскіх і англійскіх караблёў з акладам 1000 злотых у месяц [18, с. 18].

Напачатку 1609 года быў разбіты атрад шведаў, які ішоў на падмацаванне гарнізону Дынамюнда. Дзеянні войска ВКЛ на працягу ўсёй зімы былі паспяховымі, а страты – мінімальнымі [9]. Напрыканцы лютага 1609 года роты Я.К. Хадкевіча, Т. Дубровы, К. Хадкевіча, Б. Вала, А. Валовіча хутка і ціха, без распальвання вогнішчаў, пазбягаючы гасцінцаў і вёсак, выйшлі з лежа ў хадкевічаўскім уладанні Біржонах пад Шалец (Саліс, Салацгрыва), а адтуль – на Парнаву. Для звязвання сіл ворага і яго дызарыентацыі Я.К. Хадкевіч накіраваў атрад К. Тызенгаўза пад Нарву, а роту Т. Ляцкага – да Дынамюнда. Праз 6 дзён, пакрыўшы начнымі маршамі адлегласць ў 200 км, на світанку 1 сакавіка 1609 года асноўныя сілы ВКЛ з'явіліся пад Парнавай [9].

Калі спроба атакі авангарда з марша была адбіта гарматным агнём, усе войскі былі адведзены на паўмілі ад Парнавы, дзе сталі лагерам і атрымалі суровы загад не распальваць вогнішчаў і не шумець. Гэта мусіла навесці абаронцаў на думку, што ўбачаны імі атрад быў нешматлікай выведкай.

Апоўначы 2 сакавіка 1609 года пачаўся агульны штурм Парнавы [12, с. 210]. Пад агнём шведскіх ручніц, 104 гарадскіх гармат і артылерыі карабля, які стаяў на рэйдзе, 14 шатландскіх наёмнікаў Рэчы Паспалітай падабраліся да гарадской брамы і намаганнямі сапёрнага інжынера Вільгельма Барбера петардамі падарвалі адну за адной 3 гарадскія брамы, яго памочніка, таксама француза, шведы пры гэтым падстралілі. Каб спыніць спрэчкі жаўнераў наконт шляхецкага прывілея біцца конна, а не лазіць па драбінах, "як халопы", гетман ВКЛ спешыўся сам і кінуўся да горада, за ім спешылася 200 таварышаў, а 50 гусараў у поўным узбраенні нават палезлі на валы. Аддзелы ВКЛ і інфлянцы ўварваліся ў горад і захапілі яго, а калі яны пачалі падкладаць выбухоўку пад браму замка, шведы вынеслі ключы ад горада [9].

Гетман ВКЛ Я.К. Хадкевіч 2 сакавіка 1609 года ўрачыста ўехаў у Парнаву. Падчас бою было забіта 45 і паранена столькі ж ліцьвінаў. Шведы згубілі 100 забітых і 50 параненых. У палоне апынулася 300 жаўнераў, з якіх – 150 шатландскіх наймітаў пад зверхнасцю Кларка перайшлі на службу Рэчы Паспалітай. Былі захоплены ў палон жонка, сын і сястра шведскага капітана Дынамюнда Мікалая Стэрнскольда. У рукі пераможцаў трапілі ўсе шведсія гарматы, 2 гандлёвыя караблі, шмат лодак і барак [12, с. 213]. Гетман ВКЛ падзяліў здабычу паміж рыцарствам і нагрeдзіў параненых пры штурме жаўнераў Кірсноўскага і Скірасмоўскага. Сотня спешаных "пасілковых" вершнікаў ВКЛ былі пакінуты ў горадзе для начнога дазора на сценах і рынку [9]. Пасля гэтага войска было выведзена з горада ў поле, каб не спакушаць яго рабаваннем. Мясцовыя жыхары і служылыя сяляне, не лаяльныя Рэчы Паспалітай, былі з пашпартамі дэпартаваны на пасяленне ў польскае Памор'е, іншыя засталіся пад камандаваннем Кларка.

У Парнаве быў пакінуты гарнізон у 50 гусараў роты Я. Кішкі, 600 пяхоты, 100 шкотаў і 100 пяхоты з роты гетмана, 30 пушкароў з памочнікамі, і войскі ВКЛ выйшлі на Рыгу, пад якой высадзіўся з 8000 дэсантам Э.Ф. Мансфельд. Падчас дарогі да гетмана дайшла інфармацыя аб тым, што ў Шалцы знаходзіцца шведская эскадра, якая блакавала Рыгу з мора, і вораг не чакаў удару. Было вырашана скарыстацца з гэтай акалічнасці.

Да здабытых у Парнаве караблёў гетман ВКЛ набыў некалькі англійскіх і галандскіх барак, нагрузіў іх порахам, а на пяць караблёў пасадзіў пяхоту. Інфлянцы, якія раней прымусова служылі ў шведскім флоце і перайшлі на бок ВКЛ [19, с. 281], уначы з 23 на 24 сакавіка 1609 года ўдала скіравалі 4 брандэры, ад якіх загарэліся і пайшлі на дно 2 шведскія караблі, якія стаялі на якары ў порце Шальца. Астатняя эскадра, абстраляная з гармат і мушкетаў, ратавалася ў адкрытым моры. Больш марудная флатылія ВКЛ не стала яе пераследаваць. Порт разам з усімі запасамі правізіі і зброі дастаўся ВКЛ. Там было пакінута 200 вершнікаў з правізіяй.

Для таго каб захаваць дысцыпліну ў войску ВКЛ, Я.К. Хадкевіч распаўсюдзіў дэзінфармацыю, што на злучэнне з сіламі ВКЛ да Рыгі ідзе 2000 курляндцаў і нават "адкрыта" для войска выслаў да іх некалькі ганцоў. Пасля чаго пашыхтаваў свае вазы ў некалькі звязаных ланцугамі шэрагаў і, прыкрыўшыся імі ад шведскай марской артылерыі, прайшоў ад Шальца да Рыгі. Горад даслаў гетману ВКЛ некалькі гармат і роту кнехтаў. Паколькі Э.Ф. Мансфельд меў значную колькасную перавагу, было небяспечна ладзіць з ім вялікую бітву. Таму армія Я.К. Хадкевіча прайшла недалека ад шведаў і пераправілася на іншы бок Дзвіны, схаваўшыся за пагоркамі і лесам.

Мансфельд вырушыў свае васьмітысячнае войска за ім у пагоню. Калі перадавыя часткі шведаў пабудавалі мост і пачалі пераправу праз раку, вялікі гетман ВКЛ вывеў свае войскі з засады і ўдарыў па ворагу кавалерыяй. Увесь авангард шведаў, які не паспеў пашыхтавацца, быў знішчаны. Потым былі захоплены масты, і шведы на іншым баку Дзвіны пайшлі ўраструску [12, с. 215]. У палон трапіла 100 чалавек, захоплена 18 харугваў, забіта да 2000 шведаў. Пасля гэтай перамогі войска ВКЛ аблажылі Дынамюнд,

а Э.Ф. Мансфельд зняў аблогу з Рыгі і накіраваўся пад Парнаву, дзе заблакіраваў тамашні гарнізон ВКЛ і накапаў паміж морам і горадам умацаваны лагер [12, с. 214]. Наступіў перапынак у баявых дзеяннях.

Вайсковае кіраўніцтва ВКЛ імкнулася забяспечыць дзяржаўную падтрымку для войска ў Інфлянтах. У ліпені 1609 года Жыгімонт Ваза ў Вільні выказаў падзяку за службу Я.К. Хадкевічу і жаўнерам і падпісаў ім некалькі маёмасных прывілеяў [20, арк. 737 – 770; 21]. Шла падрыхтоўка да вайны з Маскоўскай дзяржавай і фінасаванне інфлянцкага войска станавілася праблематычным. Прадстаўнікі ад інфлянцкага войска прысутнічалі на вальных соймах і сойміках ВКЛ, ведалі аб цяжкасцях у зборы падаткаў для своечасовага забеспячэння ваенных дзеянняў і кампенсацыі страт на ўзбраенне, але дэманстравалі паслам соймавыя канстытуцыі і патрабавалі, каб улады выканалі свае ранейшыя абяцанні [22]. У канцы чэрвеня 1609 года гетман ВКЛ наняў аддзел пяхоты і сачыў за тым, каб навабранцы былі апранутыя і ўзброеныя ў Вільні і выправіліся ў Інфлянты [23]. Дваццатага жніўня 1609 года Я.К. Хадкевіч выехаў да войска ў Інфлянты [12, с. 219], дзе пісьмова пацвердзіў, што будзе "разам з жаўнерамі", чым фактычна далучыўся да канфедэрацыі [9]. Праблема забеспячэння жаўнераў засталася нявырашанай, аднак "праканфедэрацкая" пазіцыя і аўтарытэт гетмана дазволілі выканаць задачы кампаніі 1609 года сканфедэраваным войскам.

У канцы жніўня дзьве тысячы войска ВКЛ падышло пад Парнаву. Шведы паспрабавалі падпільнаваць войскі на начлезе за 30 км ад Парнавы, былі адкінуты і, адыходзячы, завалілі дарогу дрэвамі і засекамі. Зразумеўшы, што накірунак удара раскрыты, Я.К. Хадкевіч правёў нечаканы рэйд па накірунку Белы камень – Каркус – Фелін і з'явіўся пад Старой Парнавай з поўначы 15 верасня 1609 года. Войска Я.К. Хадкевіча захапіла форт на дарозе з Парнавы на Рэвель, спыніліся ў 4 мілях ад лагера шасцітысячнай арміі шведаў. Драбы пачалі будаваць мост праз раку Парнава, каб ахапіць шведаў у абцугі ці выцягнуць на адкрыты бой [23]. Шведы паспрабавалі напасці на лагер ВКЛ, былі адкінуты, аднак ім удалося выйсці са свайго лагера і пабудаваць новы ў 7 км па дарозе на Рэвель у моцнай пазіцыі паміж багнаў і пушчаў. Адыходзячы, шведы нарабілі засекаў па дарогах і шырока разаслалі свае раз'езды, чым перарвалі падвоз харчавання войску ВКЛ. У баях пад Парнавай войска ВКЛ страціла 100 чалавек забітымі [19, с. 282], шведы – каля 400 чалавек і 2 палявыя гарматы. З-за праблем забеспячэння войска ВКЛ праз 2 тыдні ад пачатку кампаніі пачаўся вельмі моцны голад, рыцарам прыходзілася піць марскую ваду.

Мансфельд спачатку адвёў армію ў бок Рэвеля, але затым да яго падышлі падмацаванні, складзеныя з 2000 шведскіх драбаў, галандскіх, шатландскіх, 3000 французскіх і валонскіх вершнікаў-наёмнікаў, і зноў атрымаў двухкратную перавагу (5000 супраць 2500 чалавек у Хадкевіча). Забяспечыўшы 520 драбаў пад камандаваннем Я. Мелецкага і 50 казакоў у гарнізоне Парнавы харчаваннем, Я.К. Хадкевіч даведаўся ад перабежчыка-валона аб планах шведаў ісці пад Рыгу, каб дэблакіраваць Дынамюнд, і 22 верасня 1609 года вырашыў іх апярэдзіць, канчаткова зняць пагрозу Рызе [22].

Галоднае войска ВКЛ знаходзілася на мяжы бунта, некаторыя жаўнеры палічылі кампанію завершанай і без загада гетмана накіраваліся на поўдзень Інфлянтаў. Войска ВКЛ рухалася хутчэй за шведаў. Падчас маршу пад Дынамюнд 200 вершнікаў і каля 500 драбаў дэзерціравалі, а рэшта войска 29 верасня 1609 года (дзень Св. Міхала) у Адзельскім касцёле абвясціла канфедэрацыю з патрабаваннем выплаты жолду [9]. Аднак з'яўленне шведаў пад кіраўніцтвам Э.Ф. Мансфельда непадалёк ад Рыгі дазволіла гетману ВКЛ пераканаць рыцарства застацца і змагацца [9]. Два дні войска ВКЛ выклікала ворага на бітву, але той ухіляўся.

Шостага кастрычніка 1609 года Я.К. Хадкевіч выставіў каля ракі Гаўя "безабаронны" абоз, дзе нібыта цьвічыў навабранцаў [22], пад удар шведаў і прымусіў шведаў спачатку падзяліць сілы, а потым парушыць шэрагі. Пасля чаго харугвы Т. Дубровы, Я.К. Хадкевіча, Аляксандра Галоўчынскага, Мікалая Нарушэвіча ўдарылі з засады ў фланг ворага, і інфлянцкая групоўка шведаў была канчаткова знішчана [22; 25, с. 58 – 59; 26, с. 155 – 157]. Войска ВКЛ гнала ворага 2 мілі, захапіла ў палон 100 афіцэраў, 14 харугваў, забіла і параніла 1500 шведаў і іх наймітаў [27]. Пасля бітвы гетман ВКЛ упрасіў канфедэратаў застацца ў правінцыі яшчэ на 2 тыдні, каб здабыць Дынамюнд [9].

Шантажуючы каменданта Дынамюнда высылкай яго сваякоў у польскую няволю, Я.К. Хадкевіч прымусіў таго выпусціць з палона невядомага нам ксяндза езуіта і хадкевічаўскага кліента – быхаўскага намесніка, Андрэя Пукля [12, с. 224]. Перамовы, якія праводзіў будучы рыжскі староста А. Радзівіл, склаліся ўдала [21]. Шведскі гарнізон капітуляваў *9 кастрычніка 1609 года* [25, с. 58 – 59; 28]. Гетман ВКЛ адпусціў усіх палонных і даў 218 злотых дынамюндскай пяхоце і 396 злотых іх капітану А. Статэльсану на дарогу дамоў [13, арк. 117]. У той жа дзень, так і не дачакаўшыся абяцаных каралём грошай ад кароннага падскарбія, на чацвёртым ад пачатку канфедэрацыі коле, шляхецкая кавалерыя палічыла вайну скончанай, стварыла канфедэрацыю і з'ехала з Інфлянтаў у Гарадзенскую эканомію.

Жыгімонт Ваза чарговы раз паабяцаў выплаціць канфедэратам грошы і заклікаў далучыцца да дзяржаўных войскаў, якія з верасня 1609 года аблажылі Смаленск. Агулам кампанія 1609 года каштавала скарбу ВКЛ 54413 злотых, а асабіста Я.К. Хадкевічу – 35311 злотых, аднак жаўнеры грошай у Рызе не

дачакаліся [13, арк. 117 – 123]. Нягледзячы на наяўнасць у гетмана ВКЛ звестак аб канцэнтрацыі ў Эстляндыі пабітых шведаў, зборы ў Швецыі паспалітага рушання, найме на шведскую службу 5000 шкотаў і англічан, і нявызначанасці будучага накірунку іх удару – ці ў Маскоўскую дзяржаву, ці ў Інфлянты, зімой 1609/1610 гадоў з 1200 чалавек пяхоты з Рэчы Паспалітай не дайшлі да інфлянцкіх гарнізонаў, а з 600 драбаў у Парнаве засталося 200 [30; 31]. Далей задача абароны Інфлянтаў лягла на мясцовую земскую службу, дабраахвотнікаў і скарб ВКЛ.

Пачаліся перамовы аб перамір'і. Пасля смерці Карла IX 30 кастрычніка 1611 года Жыгімонт Ваза паспрабаваў аспрэчыць заняцце пасады караля Швецыі Густавам II Адольфам. Аднак Рэч Пасалітая не магла весці адначасова вайну з Маскоўскай дзяржавай і Швецыяй, таму кароль даў згоду на заключэнне перамір'я. Адной з умоў перамір'я, заключанага 16 кастрычніка 1611 года, была канстатацыя таго, што Жыгімонт III – уладар Рэчы Пасалітай, а не Швецыі.

**Заключэнне.** У выніку кампаніі 1609 года войска ВКЛ пад кіраўніцтвам Я.К. Хадкевіча здолела адстаяць Інфлянты ў складзе Рэчы Паспалітай. Нягледзячы на тое, што быў страчаны Белы Камень, але ліквідавана пагроза Рызе і вызвалена Парнава, тэрыторыя Інфлянтаў вярнулася да status possesio на 1582 год. Войска, якое ваявала ў Інфлянтах, было складзена і аплочана ў асноўным ураджэнцамі ВКЛ і Інфлянтаў. Большая частка кампаніі была праведзена войскам, якое было ў стане канфедэрацыі, што выклікала праблемы з дызертырствам і дысцыплінай, але гетман ВКЛ Я.К. Хадкевіч вельмі ўдала выкарыстаў свой вайсковы талент і салідарнасць канфедэратаў для выканання задачы кампаніі і захавання Інфлянтаў у складзе Рэчы Паспалітай.

## ЛІТАРАТУРА


1. Szelągowski, A. Walka o Bałtyk (1544 – 1621) / A. Szelągowski. – Lwów – Poznań: Nakład Wydownictwa Polskiego, 1921. – 324 s.
2. Тила, А.А. Борьба литовских и шведских феодалов из-за Ливонии в конце XVI – начале XVII века, политические и экономические последствия для Литвы: автореф. дис. … д-ра ист. наук: 07.00.02 / А.А. Тила. – Вильнюс, 1987. – 41 с.
3. Ліст, Я.К. Хадкевіча да Жыгімонта Вазы з Ляхавіч 1608 г. / Я.К. Ліст // Бібліятэка Чартарыйскіх. – Кракаў // BCzart. – Rkps. 104. – № 74.
4. Замірэнне паміж панам гетманам (Я.К. Хадкевічам) і панам падчашым ВКЛ (Я. Радзівілам) абоз пад Берасцем і Старой вессю 20.06.1608 // BCzart. – Rkps. 104. – № 61.
5. Wisner, H. Lisowczycy / H. Wisner. – Warszawa: Książka i wiedza, 1972. – 357 s.
6. Ліст Гераніма Хадкевіча да Л. Сапегі, 1609 г. // Дзяржаўны архіў на Вавелі. Кракаў (APW.) – Архіў Сангушкаў (AS.) – Rkps. Sygn. 51. – Арк. 59.
7. Historia Dyplomacji Polskiej / pod red. Z.Wójcika. – Warszawa: Panstwowe wydawnictwo naukowe, 1982. – T. 2. – 775 s.
8. Інструкцыя і тлумачэнне фелінскіх мяшчан пасля дабраахвотнай здачы горада, дадзеная пасля ліставога загада гемана. Дэрпт. 1608 г. // BCzart. – Rkps. 3238. – Арк. 52 – 54.
9. Інструкцыя Я.К. Хадкевіча (тдумачэнне колькіх пунктаў аб каторых з панам падканцлерам гаварыў праз Радвана да абозу пасланыя), 1609 г. // BCzart. – Rkps. 103. – № 258.
10. Справаздача Яраша Валовіча, падскарбія земскага за 1605 г., учыненая на сойме Варшаўскім 30.03.1613 // Рас. нац. бібл. Санкт-Пецярбург (РНБ). – Автографы Дубровского. – Авт. 63/2. – Арк. 38 – 40.
11. Выказ сум, занятых Я.К. Хадкевічам на вайну ў Інфлянтах, у рукі Андрэя Пукля паданыя 12.01.1610 // BCzart. – Rkps. 3236. – № 64.
12. Naruszewicz, A. Historyja J.K. Chodkiewicza wojewody wileńskiego hetmana WXL / A. Naruszewicz. – Warszawa: Drukarnia № 645 przy Nowolipiuju, 1805. – T. 1. – 450 s.
13. Рэестр выплаты войску ў Рызе 1609 г. // Архіў Галоўны Актаў Даўніх. Варшава (AGAD). – Акты скарбовых камісій (ASK). – Dz. II. – Sygn. 39.
14. Галубовіч, В. Інструкцыя полацкай шляхты на сойм 1608 г. / В. Галубовіч, А. Радаман // Commetarii polocenses historici. – 2006. – Т. III. – С. 70 – 72.
15. Volumina legum: w 9 t. / nakladem i drukiem Jozofata Ohryzki. – St. Petersburg: Przedruk zbioru praw staraniem xx. pijarow w Warszawe, od roku 1732 do roku 1782, wydanego, Drukarnia J. Ohryzki, 1859. – T. II: Ab anno 1550 ad annum 1609. – 482 s.
16. Універсал некаторых паветаў да Інфлянтаў прылеглых са стараны небяспекі ад шведаў каб да пана гетмана купіліся як на гвалт. 26.08.1608. Кракаў // Нацыянальны Гістарычны Архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 289. – Арк. 370.

17. Urwanowicz, J. Wojskowe "sejmiki" koła w wojsku Rzeczypospolitej XVI – XVIII wieku / J. Urwanowicz. – Białystok: Dział wydawnictw filii UW w Białymstoku, 1996. – 265 s.
18. Wisner, H. Wojsko Litewskie w XVII wieku / H. Wisner // Studia i materialy do historii wojskowosci. – Warszawa, 1976. – T. XX. – Cz. II. – S. 5 – 27.
19. Podhorodecki, L. Slawni hetmani Rzeczy Pospolitej / L. Podhorodecki. – Warszawa: Moda, 1994. – 560 s.
20. НГАБ. – Фонд КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 80. Метрыка ВКЛ. Прывілеі шляхце на трыманне пасад і маёмасці ў Інфлянтах і ВКЛ 1588 – 1614 гг.
21. Прывілей Жыгімонта Вазы ротмістру Герману Рамелю за ваенныя паслугі. Жнівень 1609. Вільня // BCzart. – Rkps. 104. – № 187.
22. Ліст Я.К. Хадкевіча да Жыгімонта Вазы пасля бітвы і атрымання Дынамента 22.10.1609 // Бібліятэка імя Рачыньскіх. Познань. Аддзел рукапісаў (BRacz.). – Rkps. 33. – № 56.
23. Ліст Я.К. Хадкевіча да Жыгімонта Вазы 1609 г. з Інфлянтаў // Архіў Дзяржаўны на Вавелі. Кракаў (APW). – Архіў Хадкевічаў (ACh.) – Rkps. Sygn. 16.
24. Ліст Я.К. Хадкевіча да падскарбія Я. Валовіча ад 15.09.1609, Парнава // APW. – Архіў Сангушкаў (AS). – Rkps. Sygn. 40. – Арк. 351.
25. BCzart. – Rkps. 3238. Кніга гетманская. Карэспандэнцыя Аляксандра Хадкевіча і Я.К. Хадкевіча 1608 – 1609 гг.
26. Korrespodencye Jana Karola Chodkiewicza poprzedzone opisem rękopismów z archiwum radziwiłłowskiego, znajdujących się w Bibliotece Ordynacyi Krasińskich połączonej z Muzeum Konstantego Świdzińskiego / Opracował i opisał W. Chomętowski. – Warszawa: Drukarnia Jana Naworskiego, 1875. – 193 s.
27. Я.К. Хадкевіч да Л. Сапегі. 22.10.1609. Рыга // BCzart. – Rkps. 3237. – № 58.
28. Я.К. Хадкевіч да Раба // BCzart. – Rkps. 3237. – № 54.
29. Filipczak-Kocur, A. Konfederacia grodzieńska wojska litewskiego w latach 1609 – 1610 / A. Filipczak-Kocur // Pamiętnik Biblioteki Kórnickiej. – Kórnik, 1981. – Z. 18. – S. 175 – 198.
30. Я.К. Хадкевіч да Л. Сапегі 20.11.1609 Рыга // BCzart. – Rkps. 3237. – № 59.
31. Я.К. Хадкевіч да Л. Сапегі 30.11.1609 Бержоны // BCzart. – Rkps. 3237. – № 60.

*Паступіў 06.06.2013*

## THE CAMPAIGN OF GRAND DUCHY OF LITHUANIA AGAINST INFLANTY IN 1608 – 1609

***V. YAKUBAU***

*The specification and description of the little explored in the world historiography campaign of Grand Duchy of Lithuania troops are presented. The composition of the participants and the sources of financing of military operations in 1608 – 1609 against the Swedes in Inflanty is analyzed. Psychological, tactical and military leadership techniques are considered, which allowed on the one hand to perform tactical and strategic objectives of the campaign, and on the other, became a prologue to the Grodno Confederation of 1609 – 1610, which the great hetman of GDL joined for the first time in the Belarusian history.*